# ДА ЮБІЛЕЯЎ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ Я.ЦІКОЦКАГА, А.БАГАТЫРОВА, І.ЛУЧАНКА

03 снежня 2018

**Лекцыя-канцэрт, прысвечаная творчасці выдатных беларускіх кампазітараў, адбылася 27 лістапада ў дзіцячай школе мастацтваў №2 імя У.У.Алоўнікава. Гэтае мерапрыемства, прымеркаванае да Году малой радзімы, было прысвечана роднай спадчыне, роднай гісторыі, роднаму мастацтву. Вядучая Наталля Віктараўна Валодзіна пазнаёміла слухачоў з творчасцю Ігара Лучанка, Яўгена Цікоцкага, Анатоля Багатырова, а таксама з цікавымі звесткамі з жыцця і музычнымі творамі іншых прадстаўнікоў беларускай музычнай культуры.**



**Менавіта ў снежні адзначаецца 125-годдзе з дня нараджэння кампазітара Яўгена Карлавіча Цікоцкага, творчая біяграфія якога пачыналася у нашым родным Бабруйску. Творчы шлях кампазітара ахоплівае больш за чатыры дзесяцігоддзі і шмат у чым не толькі адлюстроўвае, але і вызначае тыя працэсы і з’явы, што мелі месца на розных этапах станаўлення беларускага музычнага мастацтва.**



**Значную ролю адыграў у развіцці беларускай прафесійнай музыкі і кампазітар  Анатоль Багатыроў (1913-2003) , які доўгі час таксама працаваў ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Усе вучні Багатырова – адметныя творцы. На жаль,  зусім нядаўна беларуская культура страціла аднаго з іх, вядомага кампазітара-песенніка Ігара Лучанка на 81-м гаду жыцця. У канцэрце прагучалі яго вядомыя творы “Я не магу пра вас забыцца”, “Памяць сэрца”, “Мой родны кут”.**



**Беларускія кампазітары натхнёна апявалі свой “родны кут”, дзе нарадзіліся, жылі і працавалі. Любоў да роднай прыроды, да беларускага народа, да сваёй радзімы стала жыватворнай крыніцай, дзякуючы якой з’явілася шмат адухоўленых і самабытных твораў, якія кранаюць сэрцы слухачоў.**















**У канцэрце прынялі ўдзел  настаўнікі Таццяна Уварава-Кавалеўская, Іна Бараненка, Аляксандра Шацкая, вучні Валерыя Заяц, Валерыя Здаранок, Паліна Сівачэнка, Кацярына Шаталава, Валерыя Саковіч, Ганна Кручыніна, Уладзіслаў Мароз, фальклорны ансамбль "Перапелачка" (кіраўнік  Вольга Барысава), ансамбль скрыпачоў "Каниffольки" (кіраўнік Святлана Ефімук), канцэртмайстары Ала Вянглінская, Марына Філіповіч, Святлана Дзяменцьева, Юлія Казлова, Наталля Гулевіч.**



МИКУЛИК  Е.Н.
Заместитель директора
по воспитательной работе